# Слова,




## Чым небяспечны літаратурны фаст-фуд

Святу папярэднічала вялікая размова пісьменнікаў Беларусі з калегамі з блізкага і далёкага замежжа, якая прайшла ў суботу. Яго тэму «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго: слова — стваральнае і разбуральнае» абмяркоўвала каля 60 пісьменнікаў з 10 краін блізкага і далёкага замежжа. Стасункі з замежнымі ўдзельнікамі былі наладжаны ў анлайн-фармаце.

— Такі фармат аказаўся не менш эфектыўны ў сённяшніх складаных эпідэміялагічных умовах, — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар БУЗОЎСКІ.** — Гэта дало магчымасць убачыць мерапрыемства праз сацыяльныя сеткі, праз YouTube-канал. Такое супрацоўніцтва таксама будзе садзейнічаць будучаму кнігадрукаванню, умацаванню кантактаў у пісьменніцкім асяроддзі.

Мадэратар міжнароднага круглага стала **дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** падкрэсліў, што анлайн-стасункі пашыраюць межы свята, даюць яму магчымасць ахапіць увесь свет.

— Віртуальная размова дала нам магчымасць даведацца, чым жыве літаратура замежжа. У сваім жаданні, каб слова было стваральным, мы адзіныя, — падкрэсліў ён.

Удзельнікі казалі пра важнасць захавання міру і аб тым, што кожны, хто бярэ на сябе адказнасць нешта напісаць, павінен памятаць: усякая вайна пачынаецца менавіта з друкаванага слова.

— Сёння шмат аўтараў у інтэрнэт-сеціве, чые кнігі непісьменныя і пустыя, затое патураюць чытацкім чаканням — знешне яркія, штампаваныя персанажы, прадказальны сюжэт, неабавязковы гумар, — кажа **старшыня магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАЗЕКА.** — Гэты літаратурны фаст-фуд небяспечны тым, што выклікае залежнасць. Без ідэйнага боку літаратуры быць не можа.

## Пад знакам Дабратворнага агню

У нядзелю ў Бялынічах сустракалі ўдзельнікаў Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў», якая прыбыла ў Бялынічы з Дабратворным агнём ад Гроба Гасподняга. Яна прайшла па маршруце ад мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора цераз Баранавіцкі раён, Асіповічы, Краснаполле, Касцюковічы, Хоцімск, Клімавічы. Цудатворная ікона Бялыніцкай Божай Маці, якая знаходзіцца ў Бялынічах у храме ў яе гонар, мае цікавую гісторыю з'яўлення і знаходжання ў бялыніцкай зямлі. Залатыя крыжыкі і ланцужкі за аправай абраза сведчаць, што ён шмат каму дапамог вылечыцца. Работніца храма расказала, што яе напісаў на метале архімандрыт Мелхіседэк, Міхаіл Паеўскі, які на пачатку XX стагоддзя быў тут настаяцелем. На жаль, той абраз, пра які сведчыць легенда, знік разам з крыжам Ефрасінні Полацкай у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Падчас літаратурнага свята на пляцоўцы каля храма працавала духоўна-асветніцкая выстаўка «Дакрануцца да духоўнасці», у якой прымалі ўдзел і бібліятэкі вобласці. Яны дэманстравалі ўсё, што звязана з пісьменствам на Магілёўшчыне і ў нашай краіне, пачынаючы з дзейнасці Спірыдона Собаля і рэпрынтнага выдання першага буквара да нашых сучаснікаў, пісьменнікаў і паэтаў, імёны якіх носяць бібліятэкі вобласці.

— Бібліятэкі вядуць у гэтым кірунку вялікую пошукавую работу, напрацоўваюць матэрыялы, супрацоўнічаюць з роднымі пісьменнікаў, афармляюць выстаўкі, — падкрэсліла **дырэктар абласной бібліятэкі імя Леніна Ілона САРОКІНА.**

## За найлепшыя дасягненні ў літаратуры

Дзень беларускага пісьменства — гэта свята, дзе традыцыйна агучваюцца самыя лепшыя дасягненні ў літаратуры. Заснавальнікамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі з'яўляюцца міністэрствы інфармацыі, культуры, адукацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі.

— Мы рады, што ўдзел у конкурсе прымае ўсё больш і больш беларускіх пісьменнікаў, — паведаміў **міністр інфармацыі Ігар ЛУЦКІ.** — Стала традыцыяй у рамках Дня беларускага пісьменства адзначаць яго пераможцаў. Кампетэнтным журы абраны найлепшыя ў сямі намінацыях. На конкурс былі прадстаўлены работы больш чым 80 аўтараў. Прэмія стымулюе творчасць пісьменнікаў, і вельмі важна, каб сёння ў Беларусі з'явілася як мага больш высокамастацкіх твораў.

Пераможцам у жанры «Паэзія» стаў Валерый Грышкавец, найлепшым публіцыстам прызнаны Ігар Пракаповіч за сваю работу «Пастаўшчына». Іван Саверчанка атрымаў узнагароду ў намінацыі «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства», а кніга -квэст «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці» Кацярыны Хадасевіч-Лісавой адзначана як «Лепшы твор для дзяцей і юнацтва». У намінацыі «Лепшы твор прозы» перамог Уладзімір Сцяпан. А зборнік вершаў «Сузор'е птушкі» Вольгі Нікіценкі прынёс аўтарцы званне найлепшай дэбютанткі конкурсу.





## Здабыткі

Аматары даўніны маглі пабачыць у фестывальных радах шмат цікавых рарытэтаў. Мсціслаўцы, напрыклад, прывезлі дзіўныя абразы басценавіцкай іканапіснай школы. Іконы гэтай школы захоўваюцца ў калекцыях сусветна вядомых музеяў, такіх як Эрмітаж, Нацыянальны мастацкі музей Беларусі. Супрацоўніца цэнтральнай мсціслаўскай бібліятэкі Таццяна расказала, што гэтыя іконы былі знойдзены на гарышчы падчас рэканструкцыі мясцовага храма. Работнікі культуры іх дасталі, адмылі і перадалі ў музей, які летась быў адкрыты пры мсціслаўскім храме Сілуяна Афонскага.

Музей гісторыі Магілёва прывёз усе свае скарбы, пачынаючы ад Статута, заканчваючы слуцкімі паясамі. А абласны краязнаўчы — копіі карцін мастака Мікалая II.

Глуск рэкламаваў рэчы, якія ствараліся на яго тэрыторыі ў канцы XIX стагоддзя. Там быў цэх «Спартры», дзе рабілі саламяныя капелюшы.

Свае дасягненні дэманстравалі і прадпрыемствы Беларусі. Мінскі аўтазавод рэкламаваў электробус — вельмі зручны экалагічна чысты транспарт з сучасным начыннем. Дадалося больш зручнасці і камфорту для пасажыра. Ёсць, напрыклад, кандыцыянер і інтэрфейс USB для падзарадкі тэлефона.

## І нас узнагародзілі

У рамках фестывалю прайшло шмат розных конкурсаў, у тым ліку і першага адкрытага конкурсу журналістаў і блогераў «#Дзень_Беларускага_Пісьменства2020». Першае месца ў ім заняў пісьменнік, краязнавец і журналіст — рэдактар раённай газеты «Зара над Друццю» Міхась Карпечанка. Другое месца было прысуджана спецкару газеты «Звязда» па Магілёўскай вобласці Нэлі Зугулі. Сярод прызёраў таксама прадстаўнікі інфармагенцтва «Магілёўскія ведамасці», газеты «Бабруйскае жыццё», міжнароднага радыё «Беларусь» Белтэлерадыёкампаніі, канала СТБ, тэлерадыёкампанія «Магілёў» і іншыя.

— Дзень беларускага пісьменства — запатрабаванае свята, якое выклікае цікавасць у людзей, — адзначыла **старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз журналістаў», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Святлана ШУТАВА.** — Гэтую




## Спадчыну трэба зберагчы

З такім заклікам звярнуўся ў сваім пасланні да ўдзельнікаў і гасцей свята ў Бялынічах Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Яго зачытаў падчас адкрыцця Дня беларускага пісьменства **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй КУНЦЭВІЧ.**

«Гэта свята — асаблівая падзея ў культурным жыцці Беларусі, — гаворыцца ў пасланні. — На яго пляцоўках адбываецца шматгалосы дыялог майстроў пяра — пісьменнікаў і паэтаў — пра лёс слова і культуры, сучаснасць і будучыню нашага народа. Тут сустракаюцца, узбагачаючы творчую ніву, літаратура, музыка, жывапіс і іншыя віды мастацтва... Старажытныя Бялынічы — вядомы цэнтр духоўнасці зямлі беларускай, адметны куток Магілёўшчыны з багатай гісторыяй і надзвычай прыгожай прыродай, знакаміты сваімі таленавітымі творцамі... Упэўнены, гэтыя вераснёўскія сустрэчы — добрая падстава для кожнага з удзельнікаў і гасцей Дня пісьменства яшчэ раз зразумець, што беларусаў, якіх бы поглядаў яны ні прытрымліваліся, заўсёды аб'ядноўваюць матчына мова, адзіны лёс і Бацькаўшчына. І гэты каштоўны скарб-спадчыну мы павінны зберагчы для нашчадкаў».

На адрас удзельнікаў і гасцей свята звярнулася **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА.** Яна адзначыла, што такія мерапрыемствы ўяўляюць адзінства друку з гісторыяй і культурай нашага народа, спрыяюць узбагачэнню беларускай самабытнасці.

Пра любоў да Айчыны і важнасць захавання у ёй міру і спакою гаварыў і **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*